Весці БДПУ. Серыя 2. 2018. № 2. С.50–55

УДК 930(476)"199/20":323.32

# ПЫТАННІ ФАРМІРАВАННЯ БУРЖУАЗІІ Ў БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНАЙ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ (90-я ГГ. XX – ПАЧАТАК XXI ст.)

**В. А. Карпіевіч,**
*дацэнт кафедры гуманітарных навук Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Беларусі, дактарант кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 03.04.18.

UDC 930(476)"199/20":323.32

# THE ISSUES OF FORMATION OF BOURGEOISIE IN BELARUS IN MODERN DOMESTIC HISTORIOGRAPHY (THE 90S OF THE XX – THE BEGINNING OF THE XXI CENTURIES)

**V. Karpiyevich,**
*Associate Professor of the Department of Humanities, University of Civil Protection of the Ministry for Emergency Situations of Belarus Doctoral Candidate of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, BSPU*

Received on 03.04.18.

У артыкуле даследуецца айчынная гістарыяграфія праблемы фарміравання буржуазіі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Існуючыя навуковыя працы толькі закранаюць такія аспекты праблемы, як дваранскае і купецкае прадпрымальніцтва, развіццё гандлю, рамяства, мануфактур і інш. Гэта сведчыць аб тым, што азначаная праблема яшчэ не стала прадметам спецыяльнага даследавання і патрабуе навуковага асэнсавання.

*Ключавыя словы:* буржуазія, прадпрымальніцтва, прамысловасць, капіталізм, мануфактура, фабрыкі, гандаль, купецтва, дваранства

The article researches the native historiography of the problem of the bourgeoisie formation at the end of the XVIII – the beginning of the XX centuries. The existing scientific works only touch upon such aspects of the problem as nobility and merchant entrepreneurship, trade, handicraft, manufactory development and some other problems. It proves that the problem of the bourgeoisie formation has not yet become the subject of special investigation and requires further scientific comprehension and development.

*Keywords:* bourgeoisie, entrepreneurship, industry, capitalism, manufactory, factories, trade, merchants, nobility.

*Уводзіны.* Праблема генезісу капіталістычных адносін па-ранейшаму застаецца адной з важнейшых у сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Гэтаму пытанню прысвечаны розныя навуковыя публікацыі. У русле гэтай праблемы знайшлі сваё адлюстраванне такія праблемы, як развіццё капіталізму наогул, гандлёвыя адносіны, развіццё транспарту, фінансаў і інш. Існуюць таксама працы, якія тычацца асобных сацыяльных груп: купецтва, дваранства, разгледжаны некаторыя аспекты прадпрымальніцкай дзейнасці. Аднак па-за ўвагай даследчыкаў засталася такая важная тэма, як фарміраванне буржуазіі ў Беларусі ў часы Расійскай імперыі. Асобныя даследчыкі толькі закранalі ў сваіх работах гэту тэму. Можна сцвярджаць, што ў айчыннай гістарыяграфіі не існуе комплекснага даследавання, прысвечанага праблеме фарміравання буржуазіі на беларускіх землях у XIX – пачатку XX ст.

*Асноўная частка.* Адной з першых навуковых публікацый, якая тычылася праблемы фарміравання буржуазіі, быў артыкул «Буржуазія», які змешчаны ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі. Неабходна адзначыць, што аўтары артыкула даюць даволі грунтоўнае вызначэнне тэрміна «буржуазія»: грамадскі клас, які валодае сродкамі вытворчасці, ідэямі і навыкамі для арганізацыі рынкавай гаспадаркі і жыве за кошт інвестыцыі капіталаў [1, с. 135]. Такое вызначэнне дае падставу размяжоўваць паняцці «буржуазія» і «прамыслоўцы», што сустракаецца ў сучасных публікацыях. Сапраўды, любога рамесніка або дробнага гандляра можна аднесці да прамыслоўца, аднак, згодна прыведзенай дэфініцыі, нельга аднесці да буржуазіі.

У цэлым, характарызуючы буржуазію ў Беларусі, аўтары артыкула значную ўвагу надаюць праблеме фарміравання беларускай

аграрнай буржуазіі. У якасці асноўных крыніц фарміравання беларускай буржуазіі яны разглядаюць сялянства і гандляроў. Пры гэтым паніжаючы значэнне і магчымасці станаўлення беларускай прамысловай буржуазіі, аўтары сцвярджаюць, што ў XIX ст. беларусы не мелі сваіх буйных прамыслоўцаў, банкіраў, аптовых гандляроў і інш. [1, с. 136].

Першыя працы, якія закраналі пытанні прадпрымальніцкай дзейнасці былі надрукаваны ў 90-я гг. XX – на пачатку XXI ст., у асноўным тычыліся гандлю. В. В. Швед у сваёй рабоце «Торговля в Белоруссии в период кризиса феодализма (1830–1850)» [2] дасканала вывучае склад купецтва Беларусі ў вызначаны час, памеры яго капіталаў, крыніцы іх папаўнення. Даследчык таксама закранае і ўдзел гандлёвага капіталу ў развіцці прамысловасці. На падставе наяўных статыстычных даных В. В. Швед канстатуе павелічэнне купецкіх прадпрыемстваў, аналізуе асноўныя іх галіны.

Н. І. Палятаева ў сваім артыкуле «Из истории торговли Беларуси (80–90-е гг. XIX в.)» разглядае даныя працэнтнага і раскладачнага збору і аналізуе тавараабарот Беларусі ў 80–90-я гг. XIX ст. На падставе крытычнага аналізу аўтар удакладняе асобныя высновы Л. М. Міхневіча, якія тычацца тавараабароту напрыканцы XIX ст. У артыкуле «Торговые дома Беларусі (60-е гг. XIX – начало XX в.)» Н. І. Палятаева разглядае дзейнасць буйных беларускіх фірм, якія існавалі ў дадзены перыяд і займаліся гандлёвай і прамысловай дзейнасцю [3].

На пачатку XXI ст. быў абаронены шэраг кандыдацкіх дысертацый, якія тычацца гісторыі гандлю і арганізацыі гандлёвай дзейнасці – В. А. Карпіевіча [4], М. М. Шаўчэні [5] і С. А. Сямёнавай [6]. У гэты ж перыяд з'яўляюцца і іншыя працы, якія закранаюць праблему фарміравання і развіцця буржуазіі ў Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.

Увагу заслугоўвае праца З. В. Шыбекі «Гарады Беларусі» [7]. Аўтар, абапіраючыся на разнастайны фактычны матэрыял, паказаў, якую ролю адыгрывалі гарады і мястэчкі Беларусі ў другой палове XIX ст. у якасці важных цэнтраў гандлёвага і прамысловага прадпрымальніцтва. Аўтар прыйшоў да высновы, што ў паслярэформенны час закладвалася спецыфіка гарадской прамысловасці Беларусі, якая была арыентавана на выраб прадметаў ужытку. Яшчэ адной асаблівасцю беларускай прамысловасці З. В. Шыбека лічыць цесную сувязь прамысловасці з сельскагаспадарчай вытворчасцю. Негатыўным момантам у развіцці прамысловасці аўтар лічыць шматгаліновасць беларускай прамысловасці і яе нізкую спецыялізацыю ў агульнарасійскім маштабе. У сваю чаргу З. В. Шыбека адзначае высокі ўзровень развіцця гарадского гандлю ў Беларусі, які тут быў, на яго думку, больш разнастайны, чым у іншых рэгіёнах. Аднак, разважаючы аб праблеме мадэрнізацыі беларускага грамадства ў другой палове XIX ст., З. В. Шыбека не вызначае яе галоўную рухаючую сілу – буржуазію. Разглядаючы склад насельніцтва гарадоў і мястэчак Беларусі, аўтар аналізуе яе толькі ў межах прынятай на той час саслоўнай структуры.

Адной з буйных прац, якая закранае праблему фарміравання буржуазіі ў Беларусі часоў Расійскай імперыі, з'яўляецца манаграфія А. М. Лютага «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя» [8]. Аналізуючы працу «История рабочего класса Белорусской ССР», А. М. Люты лічыць, што пачатак генезісу капіталізму ў Беларусі адносіцца да канца XVIII – пачатку XIX ст., а не да больш ранняга перыяду, як гэта сцвярджаецца ў абагульняючай працы, і ў сваю чаргу падымае пытанне аб неабходнасці больш дасканалага вывучэння праблемы фарміравання беларускай нацыянальнай буржуазіі [8, с. 36].

Аналізуючы развіццё таварнай гаспадаркі, А. М. Люты прыйшоў да высновы, што ў першай палове XIX ст. былі падрыхтаваны толькі ўмовы для зараджэння капіталістычнай вытворчасці. Галоўную праблему ў слабасці развіцця капіталістычных адносін ён бачыць у шырокім распаўсюджанні вотчыннай прамысловасці, якая супярэчыла развіццю ў Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. капіталістычных мануфактур у гарадах і мястэчках [8, с. 80]. Аўтар лічыць, што адной з прычын слабасці фарміравання буржуазіі ў беларускіх губернях было тое, «што Беларусь уступіла на шлях буржуазнага развіцця са спазненнем. Гандлёваліхвярская буржуазія была самай шматлікай і фактычна адзінай катэгорыяй класа буржуазіі» [8, с. 222].

Заслугоўвае ўвагі і сцвярджэнне А. М. Лютага, што не ўсіх багатых можна лічыць буржуазіяй. Па меркаванні аўтара, яны станавіліся капіталістамі толькі тады, калі ўкладвалі свае грошы і зямлю ў капіталістычна арганізаваныя прадпрыемствы і гаспадаркі [8, с. 225].

У сваім даследаванні Л. Э. Пракаповіч «Становление и развитие фабрично-заводской промышленности в Беларуси в XIX в.» [9] на падставе розных даных разглядае ўмовы і асаблівасці развіцця фабрычна-заводскай прамысловасці ў Беларусі на працягу XIX ст. Тым не менш, здзіўленне выклікае сцвярджэнне Л. Э. Пракаповіч, што наяўнасць машын і ўкараненне новых тэхналогій не павялічвае

вытворчасць працы, а гэта адбывалася пры росце колькасці рабочых [9, с. 72]. Цікавасць выклікаюць і высновы аб тым, што ўплыў фабрычна-заводскай прамысловасці на эканамічныя і сацыяльныя працэсы быў слабым у Беларусі [9, с. 72]. Гэта ў пэўнай ступені супярэчыць высновам, якія зрабілі некаторыя айчынныя даследчыкі ў сваіх працах ў папярэдні час (З. В. Шыбека, Н. І. Палятаява, А. П. Жытко).

Асобныя формы арганізацыі вытворчай дзейнасці разглядаліся ў дысертацыях А. Э. Лютай [10] і А. А. Башмакова [11]. Найбольш дасканала праблема прадпрымальніцкай дзейнасці была разгледжана ў дысертацыі А. В. Бурачонка «Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-завадской вытворчасці (1861–1914 гг.)» [12]. На падставе шматлікіх даных ажыццяўляецца аналіз асноўных форм прамысловага прадпрымальніцтва. Прычынамі адносна нізкага ўзроўню развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці аўтар лічыць абмежаванасць палітыкі імперскага ўрада, якая праявілася ў запозненасці правядзення буржуазных рэформ у заходніх губернях, у тарыфнай і падатковай палітыцы. Асаблівая ўвага ў працы ўдзяляецца станаўленню прамысловага прадпрымальніцкага слоя. Асноўнымі крыніцамі яго папаўнення вызначаюцца прадстаўнікі дваранства, купецтва, мяшчанства і сялянства.

Што тычыцца галін прамысловасці, то і тут можна выдзеліць шэраг прац. Цікавасць выклікаюць даследаванні А. Л. Кіштымава. У артыкуле «Асноўныя этапы развіцця і галіновая характарыстыка народнай гаспадаркі Беларусі» А. Кіштымаў адзначыў, што лідарамі тэхнічнага прагрэсу першай паловы XIX ст. у Беларусі былі асобныя прадпрыемствы тэкстыльнай і харчовай прамысловасці, а ў другой палове XIX – пачатку XX ст. гэтай з’яве спрыялі чыгункі, а таксама некаторыя прадпрыемствы хімічнай, папяровай і лёгкай прамысловасці [13]. Сярод іншых асобныя пытанні развіцця гаспадаркі разглядаліся ў працах А. М. Лютага і А. Э. Лютай [14], В. А. Карпіевіча [15], А. В. Бурачонка [16], у калектыўнай манаграфіі «История Белорусской железной дороги» [17].

Напачатку XXI ст. з’яўляецца яшчэ шэраг навуковых прац, якія тычацца вывучэння пэўных сацыяльных пластоў грамадства беларускіх зямель. Да іх адносяцца манаграфіі А. П. Жытко [18] і Н. І. Палятаевай [19]. Аўтары ў сваіх працах між іншым закранаюць і прамысловую дзейнасць дваранства і купецтва беларускіх губерняў.

У працы «Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.» А. П. Жытко значную ўвагу надзяляе прадпрымальніцкай дзейнасці дваранства на беларускіх землях. У манаграфіі дэталёва разглядаюцца тыя галіны, у якіх найбольш значна развіваліся дваранскія прадпрыемствы. Да іх адносяцца прадпрыемствы, звязаныя з перапрацоўкай лясной і сельскай (у першую чаргу, вінакурэнне) гаспадаркі. Пры гэтым аўтар дае дасканалае апісанне стану развіцця дваранскай прамысловасці па асноўным яе галінам, аднак не прасочвае дынамікі і тых змен, якія адбываліся на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст., і як яны ўплывалі на развіццё дваранскага прадпрымальніцтва. Выклікае пытанні і методыка падліку колькасці дваранскіх прадпрыемстваў, прыведзеная аўтарам за перыяд з 1860 па 1900 г. Колькасць дваранскіх прадпрыемстваў падлічана шляхам складання заснаваных за пяць дзесяцігоддзяў прамысловых прадпрыемстваў [18, с.173–174]. Узнікае пытанне: а ці ўсе прадпрыемствы, заснаваныя дваранамі да 1860 г. або ў 60–70-я гг., працягвалі сваю дзейнасць да 1900 г.? Таксама па-за ўвагай аўтара засталася іншая прадпрымальніцкая дзейнасць дваранства ў Беларусі.

Праблема прадпрымальніцкай дзейнасці купецкага саслоўя на беларускіх землях была закранута ў працы Н. І. Палятаевай «Купечество Беларуси 60-е гг. XIX – начало XX в.». Аўтар паказвае склад купецкіх гільдый і змены, якія закранаюць іх дзейнасць у канцы XIX ст. Н. І. Палятаева на падставе статыстычных даных аналізуе дзейнасць гільдзейскіх купцоў, вызначае тэндэнцыі, якія адбываліся ў гільдзейскім асяроддзі ў 60–70-я і 80–90-я гг. XIX ст. Вызначыўшы дынаміку росту сярод купцоў першай гільдыі, аўтар прыйшла да высновы, што ў канцы XIX ст. доля атрыманых пасведчанняў першай гільдыі ў беларускіх губернях перавышала сярэднія паказчыкі па Еўрапейскай Расіі [19, с. 82–83]. Аднак даследчык так і не дала дасканалага абгрунтавання прычынам такіх змен. Тым не менш, цікавасць выклікае праведзены падрабязны аналіз гандлёва-прадпрымальніцкай дзейнасці купцоў з улікам функцыянавання эканамічнай сістэмы беларускага рэгіёна, іх сувязь з банкаўскімі і іншымі крэдытнымі ўстановамі.

Сярод іншых даследаванняў, якія закранаюць пэўныя аспекты сацыяльнага складу буржуазіі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст., неабходна адзначыць працы А. Г. Каханоўскага [20], В. А. Сабалеўскай [21], А. Л. Кіштымава [22], К. С. Церашковай [23], А. В. Бурачонка [24].

Аналізуючы трансфармацыйныя працэсы, якія адбываліся ў беларускім грамадстве ў паслярэформенны час, А. Г. Каханоўскі ў сваёй працы «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)» паказаў іх сістэмны характар. Асаблівую ўвагу аўтар

удзяліў станаўленню буржуазнага грамадства ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Да класаў буржуазнага грамадства даследчык адносіць наступныя: буржуазія, чыноўніцтва, інтэлігенцыя, рабочы клас. Разглядаючы праблему вызначэння паняцця «буржуазія» А. Г. Каханоўскі спасылаецца на разныя погляды сучасных даследчыкаў да выкарыстання гэтага паняцця або замену яго іншымі [20, с. 228–229]. Аднак у сваёй працы даследчык не вызначае, наколькі апраўдана выкарыстанне тэрміну «буржуазія» або замена яго на іншыя («прамыслоўцы», «сярэдні клас» і інш.). Цікавасць выклікаюць высновы, які робіць А. Г. Каханоўскі ў сваёй працы. Вызначаючы асаблівасці мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў даследуемы перыяд, ён, як і З. В. Шыбека, адзначае, што канцэнтрацыя прамысловых прадпрыемстваў назіралася не ў гарадах, як гэта было ў краінах Еўропы, а у вёсках. Другой асаблівасцю беларускай мадэрнізацыі было тое, што яе рухавіком тут было дваранства, а не буржуазія [20, с. 262].

Цікавасць працы В. А. Сабалеўскай заключаецца ў тым, што яна аналізуе жыццё і эканамічную дзейнасць яўрэйскага насельніцтва Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Яўрэйскае насельніцтва ў сілу свайго непаўнапраўнага становішча і значных абмежаванняў у гаспадарчай дзейнасці з'явілася адной з важнейшых крыніц фарміравання прадпрымальніцкага класа ў Беларусі. В. А. Сабалеўская робіць выснову, што эканамічная дзейнасць стала важнейшай сферай жыцця яўрэйскага насельніцтва Беларусі [21, с. 148].

Яшчэ адным напрамкам у вывучэнні дзейнасці прадпрымальнікаў беларускіх губерняў можна выдзеліць даследаванні, якія тычацца яе ўдзелу ў дзейнасці грамадскіх і дабрачынных арганізацый, у тым ліку звязаных з распаўсюджаннем прадпрымальніцкай актыўнасці. Дадзеныя пытанні разглядаліся ў дысертацыі А. Л. Кіштымава [25], у працах В. Ф. Бацяева [26], Ю. В. Функ [27], М. А. Сакаловай [28], С. Ф. Шымуковіча [29], А. Д. Грыгор'ева [30] і інш.

*Заключэнне.* Такім чынам, нягледзячы на тое што праблема ролі купецтва, дваранства, жыхароў гарадоў і мястэчак у развіцці прадпрымальніцтва ў Беларусі з канца XVIII і да пачатку XX ст. закранался ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі канца XX – пачатку XXI ст., але яшчэ не склалася гістарыяграфічная канцэпцыя па праблеме фарміравання буржуазіі, што з'яўляецца актуальнай задачай сучаснай гістарычнай навукі.


Литаратура

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭн, 1994. – 537 с. – Т. 2. Беліцк – Гімн.
2. *Швед, В. В.* Торговля в Белоруссии в период кризиса феодализма (1830–1850) / В. В. Швед. – Гродно : ПКФ «Орбикс», 1995. – 135 с.
3. *Полетаева, Н. И.* Из истории торговли Беларуси (80–90-е гг. XIX в.) // Веснік БДЭУ. – 2001. – № 5. – С. 66–72; *Полетаева, Н. И.* Торговые дома Беларуси (60-е гг. XIX – начало XX в.) // Предпринимательство в Белоруссии. – 2000. – № 12. – С. 34–37.
4. *Карпіевіч, В. А.* Развіццё гандлю ў Беларусі (1861–1900) : дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. А. Карпіевіч. – Мінск, 2003.
5. *Шаўчэня, М. М.* Развіццё гандлю ў Беларусі (канец XVIII – першая траціна XIX ст.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / М. М. Шаўчэня. – Гродна, 2003.
6. *Семенова, С. А.* Купечество Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / С. А. Семенова. – Минск, 2004.
7. *Шыбека, З. В.* Гарады Беларусі (60–я гады XIX – пачатак XX стагоддзя) / З. В. Шыбека. – Мінск : ЭўраФорум, 1997. – 319 с.
8. *Люты, А. М.* Сацыяльна-эканамічнае развіцце Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя / А. М. Люты. – Мінск : БДПУ, 2004. – 320 с.
9. *Пракапович, Л. Э.* Становление и развитие фабрично-заводской промышленности в Беларуси в XIX в. / Л. Э. Пракапович. – Минск : БГПУ, 2010. – 156 с.
10. *Лютая, А. Э.* Ремесло в Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А. Э. Лютая ; БГПУ. – Минск, 2003. – 124 с.
11. *Башмакоў, А. А.* Мануфактурная вытворчасць і яе роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі, 1861–1914 гг. : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. А. Башмакоў; БДПУ. – Мінск, 2009. – 214 с.

References

1. Entsyklapedyya gistoryi Belarusi : u 6 t. / Belarus. entsykl. ; redkal.: B. I. Sachanka (gal. red.) i insh. – Minsk : BelEn, 1994. – 537 s. – T. 2. Belitsk – Gimn.
2. *Shved, V. V.* Torgovlya v Belorussii v period krizisa feodalizma (1830-1850) / V. V. Shved. – Grodno : PKF "Orbiks", 1995. – 135 s.
3. *Poletayeva, N. I.* Iz istorii torgovli Belarusi (80-90-ye gg. XIX v.) // Vesnik BDEU. – 2001. – № 5. – S. 66–72; *Poletayeva, N. I.* Torgovyye doma Belarusi (60-ye gg. XIX – nachalo XX v.) // Predprinimatelstvo v Belorussii. – 2000. – № 12. – S. 34–37.
4. *Karpiyevich, V. A.* Razvittsyo gandlyu u Belarusi (1861–1900) : dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / A. A. Karpiyevich. – Minsk, 2003.
5. *Shauchenya, M. M.* Razvittsyo gandlyu u Belarusi (kanets XVIII – pershaya tratsina XIX st.) : dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / M. M. Shauchenya. – Grodna, 2003.
6. *Semyonova, S. A.* Kupechestvo Belarusi vo vtoroy polovine XVIII – pervoy polovine XIX v. : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / S. A. Semyonova. – Minsk, 2004.
7. *Shybeka, Z. V.* Garady Belarusi (60-ya gady XIX – pachatak XX stagoddzya) / Z. V. Shybeka. – Minsk : EuraForum, 1997. – 319 s.
8. *Lyuty, A. M.* Satsyyalna-ekanamichnaye razvittsyo Belarusi u drugoy palove XVIII – pershay palove XIX stagoddzya / A. M. Lyuty. – Minsk : BDPU, 2004. – 320 s.
9. *Prakapovich, L. E.* Stanovleniye i razvitiye fabrichno-zavodskoy promyshlennosti v Belarusi v XIX v. / L. E. Prakapovich. – Minsk : BGPU, 2010. – 156 s.
10. *Lyutaya, A. E.* Remeslo v Belarusi vo vtoroy polovine XVIII – pervoy polovine XIX v. : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / A. E. Lyutaya ; BGPU. – Minsk, 2003. – 124 s.
11. *Bashmakou, A. A.* Manufakturnaya vytvorchasts i yaye rolya u satsyyalna-ekanamichnym razvittsi Belarusi, 1861–1914 gg. : dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / A. A. Bashmakou; BDPU. – Minsk, 2009. – 214 s.

12. *Бурачонак, А. В.* Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-завадской вытворчасці (1861–1914 гг.) : дыс. …канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Бурачонак. – Мінск, 2012. – 183 л.
13. *Кіштымаў, А. Л.* Асноўныя этапы развіцця і галіновая характарыстыка народнай гаспадаркі Беларусі / А. Л. Кіштымаў // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы / Н. В. Анофранка [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – С. 200–213.
14. *Люты, А. М.* Транспарт і фінансы і іх значэнне для генезісу капіталізму ў Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. / А. М. Люты, А. Э. Лютая // Европа : актуальные проблемы этнокультуры : сб. науч. ст. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2011. – С. 105–108.
15. *Карпіевіч, В. А.* Прамысловасць і транспарт на Беларусі ў др. пал. XIX ст. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў : зб. нав. пр. : у 2-х ч. – Мінск, 2002. – Ч. 2: Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі. – С. 126–133.
16. *Бурачонак, А. В.* Сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця прамысловага прадпрымальніцтва ў Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) / А. В. Бурачонак // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Минск : БДУ, 2014. – Вып. 9. – С. 3–14.
17. История Белорусской железной дороги. Из века XIX – в век XXI / В. В. Яновская и др. – Минск : Маст. літ., 2012. – 955 с.
18. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.
19. *Полетаева, Н. И.* Купечество Беларуси 60-е гг. XIX – начало XX в. : монография / Н. И. Полетаева. – Минск : БГЭУ, 2004. – 247 с.
20. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2013. – 335 с.
21. *Соболевская, О. А.* Повседневная жизнь евреев Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX века : монография / О. А. Соболевская. – Гродно : ГрГУ, 2012. – 443 с.
22. *Кіштымаў, А. Л.* Удзел замежных прадпрымальнікаў і фінансістаў у развіцці прамысловасці і транспарту Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / А. Л. Кіштымаў // Штогоднік Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 57–63.
23. *Церашкова, К. С.* Мяшчане ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1861–1914 гг.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / К. С. Церашкова. – Мінск, 2016. – 28 с.
24. *Бурачонак, А. В.* Прадпрымальніцкая дзейнасць мяшчанства Беларусі ў сферы прамысловасці ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / А. В. Бурачонак // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2010. – Вып. 5. – С. 3–9.
25. *Киштымов, А. Л.* Беларусь на выставках XIX – начала XX в. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. / А. Л. Киштымов ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2001. – 205 с.
26. *Батяев, В. Ф.* Развитие белорусских общественных объединений в XIX – 20-е годы XX века. Этнологическое исследование / В. Ф. Батяев ; под науч. ред. А. И. Локотко. – Минск : Право и экономика, 2007. – 381 с.; *Батяев, В. Ф.* Общественные объединения белорусов XIX – 20-х годов XX века. Этнологическое исследование : Монография / В. Ф. Батяев ; науч. ред. М. Ф. Пилипенко ; Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси. – Саранск : Без изд., 2013. – 143 с.
27. *Функ, Ю. В.* Еврейская благотворительность в Беларуси в XIX – начале XX в. и источники ее исследования : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.09 / Ю. В. Функ. – Минск, 1999. – 122 с.; *Функ, Ю. В.* Общая характеристика еврейских благотворительных обществ на территории белорусских губерний в середине XIX – начале XX в. / Ю. В. Функ // Веснік БДУ. Сер. 3. – 2011. – № 2. – С. 5–10.

12. *Burachonak, A. V.* Razvittsyo pradprymalnitstva u fabrychna-zavadskoy vytvorchastsi (1861-1914 gg.) : dys. … kand. gist. navuk : 07.00.02 / A. V. Burachonak. – Minsk, 2012. – 183 l.
13. *Kishtymau, A. L.* Asnounyya etapy razvittsya i galinovaya kharaktarystyka narodnay gaspadarki Belarusi / A. L. Kishtymau // Gistaryyagrafiya gistoryi Belarusi kantsa XIX – pachatku XX st.: prablemy, zdabytki, perspektyvy / N. V. Anofranka [i insh.] ; navuk. red. V. V. Yanouskaya. – Minsk : Belarus. navuka, 2006. – S. 200-213.
14. *Lyuty, A. M.* Transpart i finansy i ikh znachennye dlya genezisu kapitalizmu u Belarusi u drugoy palove XVIII – pershay palove XIX st. / A. M. Lyuty, A. E. Lyutaya // Yevropa : aktualnyye problemy etnokultury : sb. nauch. st. / Belorus. gos. ped. un-t ; redkol.: V. V. Tugay (otv. red.) [i dr.]. – Minsl, 2011. – S. 105–108.
15. *Karpiyevich, V. A.* Pramyslovasts i transpart na Bearusi u dr. pal. XIX st. / Aychynnaya i susvetnaya gistoryya: suchasnyyz poglyady i metady dasledavannyau : zb. nav. pr. : u 2-kh ch. – Minsk, 2002. – Ch. 2: Aktualnyya pytanni useagulnay gistoryi i gistoryi Belarusi. – S. 126–133.
16. *Burachonak, A. V.* Satsyyalna-ekanamichnyya umovy razvittsya pramyslovaga radprymalnitstva u Belarusi (drugaya palova XIX – pachatak XX st.) / A. V. Burachonak // Pratsy gistarychnaga fakulteta BDU : navuk. zb. / redkal.: U. K. Korshuk (adk. red.) [i insh.]. – Minsk : BDU, 2014. – Vyp. 9. – S. 3–14.
17. Istoriya Belorusskoy zheleznoy dorogi. Iz veka XIX – v vek XXI / V. V. Yanovskaya i dr. – Minsk : Mast. lit., 2012. – 955 s.
18. *Zhytko, A. P.* Dvaranstva Belarusi peryyadu kapitalizmu. 1861-1914 gg. / A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2003. – 233 s.
19. *Poletayeva, N. I.* Kupechestvo Belarusi 60-ye gg. XIX – nachalo XX v. : monografiya / N. I. Poletayeva. – Minsk : BGEU, 2004. – 247 s.
20. *Kakhanouski, A. G.* Satsyyalnaya transfarmatsyya belaruskaga gramadstva (1861-1914 gg.) / A. G. Kakhanouski. – Minsk : BDU, 2013. – 335 s.
21. *Sobolevskaya, O. A.* Povsednevnaya zhizn yevreyev Belarusi v kontse XVIII – pervoy polovine XIX veka : monogr. / O. A. Sobolevskaya. – Grodno : GrGU, 2012. – 443 s.
22. *Kishtymau, A. L.* Udzel zamezhnykh pradprymalnikau i finansistau u razvittsi pramyslovastsi i transpartu Belarusi (kanets XVIII – pachatak XX st.) / A. L. Kishtymau // Shtogodnik In-ta gistoryi NAN Belarusi. – Minsk, 1999. – S. 57-63.
23. *Tserashkova, K. S.* Myashchane u satsyyalna-ekanamichnym razvittsi Belarusi (1861–1914 gg.) : autaref. dys. … kand. gist. navuk: 07.00.02 / K. S. Tserashkova. – Minsk, 2016. – 28 s.
24. *Burachonak, A. V.* Pradprymalnitskaya dzeynasts myashchanstva Belarusi u sfery pramyslovastsi u drugoy palove XIX – pachatku XX st. / A. V. Burachonak // Pratsy gistarychnaga fakulteta BDU : navuk. zb. / redkal.: U. K. Korshuk (adk. red.) [i insh.]. – Minsk : BDU, 2010. – Vyp. 5. – S. 3–9.
25. *Kishtymov, A. L.* Belarus na vystavkakh XIX – nachala XX v. : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / A. L. Kishtymov ; Bel. gos. un-t. – Minsk, 2001. – 205 s.
26. *Batyayev, V. F.* Razvitiye belorusskikh obshchestvennykh obyedineniy v XIX – 20-ye gody XX veka. Etnologicheskoye issledovaniye / V. F. Batyayev ; pod nauch. red. A. I. Lokotko. – Minsk : Pravo i ekonomika, 2007. – 381 s.; *Batyayev, V. F.* Obshchestvennyye obyedineniya belorusov XIX – 20-kh godov XX veka. Etnologicheskoye issledovaniye : Monografiya / V. F. Batyayev ; nauch. red. M. F. Pilipenko ; Tsentr issledovaniy belorusskoy kultury, yazyka i literatury NAN Belarusi. – Saransk : Bez izd., 2013. – 143 s.
27. *Funk, Yu. V.* Yevreyskaya blagotvoritelnost v Belarusi v XIX – nachale XX v. i istochniki yeyo issledovaniya : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.09 / Yu. V. Funk. – Mins, 1999. – 122 s.; *Funk, Yu. V.* Obshchaya kharakteristika yevreyskikh blagotvoritelnykh obshchestv na territorii belorusskikh guberniy v seredine XIX – nachale XX v. / Yu. V. Funk // Vesnik BDU. Ser. 3. – 2011. – № 2. – S. 5–10.

28. *Соколова, М. А.* Общественные движения на территории Беларуси (XIX – начало XX в.): историография, методологические принципы исследования / М. А. Соколова. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 448 с.
29. *Шимукович, С. Ф.* Благотворительность в Беларуси в конце XIX – начале XX века [Текст] : монография / С. Ф. Шимукович ; Акад. упр. при Президенте Республики Беларусь. – Минск : Акад. упр. при Президенте Республики Беларусь, 2006. – 187 с.
30. *Григорьев, А. Д.* Частная благотворительность в белорусских губерниях Российской империи в конце XIX века / А. Д. Григорьев // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2010. – № 2. – С. 52–57.

28. *Sokolova, M. A.* Obshchestvennyye dvizheniya na territorii Belarusi (XIX – nachalo XX v.): istoriografiya, metodologicheskiye printsipy issledovaniya / M. A. Sokolova. – Minsk : Belarus. navuka, 2011. – 448 s.
29. *Shimukovich, S. F.* Blagotvoritelnost v Belarusi v kontse XIX – nachale XX veka [Tekst] : mongrafiya / S. F. Shimukovich ; Akad. upr. pri Prezidente Respubliki Belarus. – Minsk : Akad. upr. pri Prezidente Respubliki Belarus, 2006. – 187 s.
30. *Grigoryev, A. D.* Chastnaya blagotvoritelnost v belorusskikh guberniyakh Rossiyskoy imperii v kontse XIX veka / A. D. Grigoryev // Gistoryya: prablemy vykladannya. – 2010. – № 2. – S. 52–57.